# ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

Комсамольскі актыў Віцебска, сабраўшыся сумесна з трыкутнікамі прадпрыемстваў і партыйным кіраўніцтвам для сустрэчы з комсамолкамі, маладымі работніцамі, якія зрабілі пешы пераход Віцебск—Менск у процівагазах, шле палкае большэвіцкае прывітанне Вам, дарагі Нікалай Фёдаравіч **Гікало**, загартаванаму сталінцу, кіраўніку комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі, і ў вашай асобе штабу большэвікоў Беларусі—ЦК КП(б)Б, пад кіраўніцтвам якога расце і мацнее Совецкая Беларусь—квітнеючы фарпост соцыялізма на заходніх межах Совецкага Саюза.

Пераход, які зрабілі нашы комсамолкі, самыя звычайныя дзяўчаты нашай радзімы — яшчэ адзін доказ таго высокага, магутнага пачуцця совецкага патрыятызма, які ахапіў увесь совецкі народ.

У гонар нашай радзімы, у гонар нашай партыі, у гонар натхніцеля і кіраўніка нашых перамог, любімага бацькі нашага народу таварыша **Сталіна** прысвячаем мы кожны крок нашага жыцця. Тысячы маладых юнакоў і дзяўчат, працуючы па-стаханаўску, у сваёй штодзённай гераічнай рабоце бачаць росквіт нашай соцыялістычнай радзімы. Гэтыя тысячы гатовы заўжды па першаму заклику партыі і ўрада стаць на абарону непарушных граніц нашай краіны, здзіўляючы ўвесь свет сваім гераізмам.

Вы, таварыш Гікало, праз нашых дзяўчат перадалі, што «рэкорды — добрая рэч, калі за імі ідуць масы, калі яны ўзнімаюць рух мас», і паставілі перад намі задачу — зрабіць пераход адзінаццаці дзяўчат адпраўным пунктам для яшчэ большага разгортвання абароннай работы віцебскага комсамола.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы